ем музыкальных передач, другая – созданием передач для детей, третья – созданием познавательных передач и т. д.

Таким образом, в КНР развивается рыночная стратегия радиовещания, главным направлениям которой стало появление частных компаний по производству радиопродукта, трансляцией которого занимается Центральная народная радиостанция и радиостанций провинций Китая. Среди СМИ, несмотря на государственный контроль политической проблематики, разворачивается конкуренция, что повышает качество выпускаемого продукта. Особенно конкурентоспособны региональные радиостанции в силу своей локальной тематики.

В настоящее время китайская журналистика переживает глубокую реформу. Цель этой реформы: создать развитую, современную, многофункциональную и эффективную систему средств массовой информации и техническую базу, подготовленные кадры журналистов, редакторов, других специалистов. Эту долгосрочную и сложную задачу в полной мере выполняет радиожурналистика КНР.

**Литература**

1. Сайт компании «Синь Ша». [Электронный ресурс]. 2009. Режим доступа: http://company.zhaopin.com/P7/CC1488/3686/CC148836867en.htm. Дата доступа: 29.03.2009.
2. Модели функционирования частных компаний Китая. [Электронный ресурс]. 2009. Режим доступа: http://creative.wswire.com/htmlnews/2004/01/29/71482.htm. Дата доступа: 29.03.2009.

## ГОРАД ЯК КУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА Ў МАСТАЦТВЕ І Ў СМІ

**В. М. Чайкоўская**

Прастора – важная катэгорыя для фарміравання культурнага асяродку, культурнай ідэнтычнасці. Але прастора не можа з’яўляцца вызначальнай без суаднесенасці з канкрэтным часавым прамежкам. Панятак «хранатоп», уведзены М. Бахціным, як раз і характарызуе «істотную ўзаемасувязь часавых і прасторавых стасункаў» [1, с. 234 ]. «У літаратурна-мастацкім хранатопе, піша М. Бахцін, мае месца злучэнне прасторавых і часавых прыкметаў у асэнсаванае і канкрэтнае цэлае. Час тут згушчаецца, ушчыльніваецца, становіцца мастацка-бачным; прастора інтэсіфікуецца, уцягваецца ў рух часу, сюжэту, гісторыі. Прыкметы часу выкрываюцца ў прасторы, і прастора асэнсоўваецца і вымяраецца часам. Гэтым перакрыжаваннем шэрагаў і з’яднаннем прыкметаў характарызуецца мастацкі хранатоп» [1, с. 235]. Тэма прасторы, у прыватнасці горада, ейнага ўплыву на творчасць мастака і

адлюстраванне прасторы (горада) ў творчасці – досыць актуальная. Шматлікія пісьменнкі, мастакі, кінарэжысёры, журналісты адлюстроўваюць горад у сваёй творчасці. Пра тое, што вобразаў горада створана безліч, сведчыць бясконцая колькасць кінафільмаў, літаратурных твораў, твораў выяўленчага і музычнага мастацтва, якія прысвечаны пэўным гарадам. Ад фільма «Неба над Берлінам» Віма Вэндэрса да тэлефільма Уладзіміра Бокуна «Калі Віцебск быў Парыжам» і тэлесерыяла «Сэкс у вялікім горадзе»; ад апавядання Уладзіміра Сарокіна «Эрас Масквы» да кнігі прозы Пятра Вайля «Геній месца», ад 7-ай сімфоніі Дзмітрыя Шастковіча да альбома Dead Cities («Мёртвыя гарады») англійскага эмбіент-гурта Future Sound of London; ад Апалінарыя Васняцова, які ўсё жыццё прысвяціў маляванню старой Масквы, да Віцебска Марка Шагала. Горад – заўжды вельмі хранатапічная прастора, амбівалентнае месца паміж мерыдыянамі і паралелямі, вызначальнае для развіцця культуры. Усе асноўныя віды мастацтва аформіліся ў горадзе; панятак «стыль» мае дачыненне менавіта да гарадской культуры (імпрэсіянізм, мадэрн, экспрэсіянізм, мадэрнізм, структуралізм і г. д. спарадзіў горад); горад даў чалавеку салодкую магчымасць і спакуслівую перашкоду адпачынку (кірмаш, кіно, танцпляцоўка); у горадзе існавалі разнастайныя арт-кавярні, рэстарацыі для мастакоў-інтэлектуалаў, пабы, клубы, казіно, якія некалі былі неадымнай часткай (культурнымі занкамі) багемнага мастацкага жыцця Парыжа, Нью-Ёрка, Амстэрдама, Пецярбурга, і ў якіх нараджалася мастацкая ісціна. Прыгадайма фільм Алана Рудальфа «Мадэрністы» пра парыжскую багему, зняты напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

Горад, у дадзеным выпадку, не цікавіць нас як архітэктурны асяродак, як сацыяльны альбо палітычна-эканамічны. А менавіта як хранатоп аўтара; як культурны знак, код, рэфрэн, лейтматыў, які праявіўся ў творчасці пэўных аўтараў. Вядомы журналіст, пісьменнік і падарожнік Пётр Вайль – адзін з першых сучасных даследчыкаў горада як хранатопа аўтара. «Сувязь чалавека з месцам ягонага жыхарства загадкавая рэч, але відавочная. Для чалавека новага часу галоўныя кропкі прылажэння і праяўлення культурных сілаў – гарады. Напрыклад, Нью-Ёрк Драйзера і Нью-Ёрк О. Генры – гарады хоць і адной эпохі, аднак не толькі розныя, але і для кожнага асаблівыя» [2, с. 3]. Горад, паводле Вайля, якімі б становучымі альбо адмоўнымі якасцямі ні валодаў, пры спрыяльным супадзенні часава-прасторавых характарыстык усё роўна з’яўляецца плённай прасторай для развіцця мастака, мастацтва, культуры. Пётр Вайль падыйшоў да свайго даследвання як журналіст, яшчэ дакладней як

рэпарцёр, падарожнічаючы па адметных гарадах, назіраючы і супастаўляючы: Стамбул Бродскага і Стамбул Байрана, Рым Феліні і Рым рэальны і г. д. і да т. п. І як толькі Вайль абмінуў у сваіх «рэпарцёрскіх эсэ» Віцебск Шагала?

Марк Шагал сумаваў па Віцебску і прысвячаў яму сябе і сваю творчасць, як Джойс – Дубліну, а Кафка – Празе. Гэты «паэт з крыламі мастака» з'яўляецца неўміручым сімвалам-аўтарам невялікага паўночнага беларускага горада. Многія, напэўна, акрамя Шагала, нічога пра Віцебск і не ведаюць. Тым не менш, «было штосьці ў Віцебску, што натхняла на творчасць не толькі карэнных віцьбічаў, але і прышлых і праезджых, гасцей і візітораў прымушала пакінуць успамін пра яго, гэткія «вобразы Віцебска». Літаратурныя партрэты горада ёсць у прозе І. Буніна, А. Купрына, Ул. Шклоўскага, С. Эйзенштэйна, К. Паустоўскага і інш. І. Рэпін назваў Віцебск «расійскім Таледа» [3, с. 9].

Віцебск – горад ва ўсіх сэнсах неадназначны. Горад на памежжы Беларусі і Расіі, горад з дуалістычным менталітэтам. У Віцебску пачатку XX ст. усё супала: і час, і прастора, і мастацтва, і людзі. Беларускі журналіст В. Марціновіч, даследуючы праблемы віцебскай мастацкай школы, заўважыў: «Віцебскі авангард у жывапісу XX ст. быў мацней, чым іншыя накірункі, абумоўлены фактарамі часу і месца, якія з'яўляюцца трансцэндзентнымі ў дачыненні да артэфакту мастацтва як такога» [4, с. 12]. Росквіт віцебскага авангарду 1918–1922 гг., актыўная дзейнасць Народнай мастацкай вучэльні, заахвочаныя да працы вядомыя артысты – Марк Шагал стварыў такі зараджальны неверагодны амб'янс у горадзе (гэта называюць віцебскім адраджэннем), што калі вымушаны быў жыць у іншых гарадох, то яму нічога не заставалася, акрамя як тужыць па створаным ім арт-эдэме і бадай што з фатаграфічнай дакладнасцю працягваць маляваць краявіды роднага горада з фантасмагарычнымі персанажамі. Творчасць Марка Шагала – гэта параксізм самоты па Віцебску. Гэты правінцыйны горад той эпохі паўстае адным з эпіцэнтраў савецкага авангарду, горадам з плённай атмасферай для развіцця мастацтва, культурнай харнатапічнай прасторай; горадам-стваральнікам, горадам-душой, горадам-калыскай. Адметна, што айчынная прэса і сёння пазіцыянуе Віцебск як культурную сталіцу Беларусі, пераважна аргументуючы гэта традыцыйным «Славянскім базарам у Віцебску», які з'яўляецца, хутэй, прафанацыяй мастацтва; шоу-бізнэсам, які да мастацтва не мае аніякага дачынення. Мясцовыя газеты («Віцьбічы», «Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Витебский проспект») непасрэдна мастацтву ўлучаюць добра калі разгорнутую нататку, «інфармушку» з нагоды культурнай альбо

калякультурнай падзеі. «Намеснік Віцебскага аблвыканкаму Аляксандр Касінец у бліжэйшы час плануе не толькі пераўтварыць «паўночную сталіцу» ў адзін з самых сучасных і прыгожых гарадоў Беларусі, але і прыцягнуць значныя фінансавыя сродкі на развіццё рэгіёна» [5].

Скарыстаем досвед супастаўлення журналіста Пятра Вайля і параўнаем дакументальны фільм французскага рэжысёра Алена Флэшэра «У накірунку да Віцебска. Нататкі падарожніка» (2005 г.) з горадам Марка Шагала. У аўтара атрымаўся яшчэ адзін суб'ектыўны варыянт беларускага горада, нягледзячы на тое, што фільм дакументальны. Зрэшты, «любы фільм (дакументальны, гульнёвы, анімацыйны) ніколі не з'яўляецца літаральным адлюстраваннем рэальнасці, але толькі ейнай вобразнай інтэрпрытацыяй на экране» [6, с. 57]. Заканамерна, што ў замежнага госця атрымаўся Віцебск вачыма інтурыста. Тут горад патэнцыйна з'яўляецца культурнай прасторай, і француз аб'ектыўна прызнае, што таго, чым быў выбітны Віцебск у пач. ХХ ст., ужо няма. Але, і гэта ёсць галоўнай думкай А. Флэшэра, былое можа вярнуцца зноў, былая веліч і росквіт – зваротныя пры спрыяльным супадзенні часу, месца і чалавека. Цягам усяго фільма рэжысёр рэфлексуе на гэты конт, пераважна буйнымі і сярэднімі планамі павольна паказваючы свой уласны (!) Віцебск – горад-рарытэт, горад-антыкварыят, горад, які чакае адраджэння. З філасофска-ідэйнага пункту погляду ёсць на што звярнуць увагу, а з візуальнага – пасіўна і банальна. Вербальнае ў гэтым экранным творы нелагічна адыгрывае дамінуючую ролю. У беларускіх СМІ (як мясцовых віцебскіх, так і рэспубліканскіх) гэтая мастацкая з'ява не атрымала вартай увагі, а нейкага рэзанансу-абмеркавання і пагатоў. Мажліва, таму, што айчынных літаратурна-мастацкіх крытыкаў часта стрымлівае рэдакцыйная абыякавасць, перспектыўнае паланванне, нязначная колькасць якасных спецыялізаваных выданняў ды і не асаблівая цікаўнасць беларускай аудыторыі да мастацтва, наогул. Карэктна абышліся сціплымі нататкамі-анонсамі сайт «Белорусской деловой газеты» [7], сайты http://www.partal.by (снежань 2008 г.), http://www.ngo.by (8 мая 2003 г.), газета «Віцебскі рабочы» [8]. Афіцыйны сайт Музея Марка Шагала ў Віцебску змясціў інфармацыю пра фотавыставу рэжысёра і ягонае актыўнае наведванне Беларусі [9].

Мы разгледзелі, па ступнасці, два хранатопы горада: ствавральны і латэнтна-стваральны. Як кожнае выказванне кантэкстуальна, так і творчасць мастака горада – хронатапічна: актуальна і дарэчна ў кантэксце ўдалага супадзення часу і месца. Як у народзе кажуць: апынуцца ў спрыяльны час у спрыяльным месцы. Горад – вызначальны асяродак для фарміравання і развіцця мастацтва, шматпатэнцыйная

культурная прастора; полісемантычная сукупнасць часава-прасторавых характарыстык, якія ўплываюць на мастака, ягонае жыццё і творчасць. Беларускім СМІ варта б звяртаць больш увагі на тое, што адбываецца ў беларускіх жа гарадах. Бо часам нават госьці больш пільна прыглядаюцца да нашага, чым мы самі. Рызыкнем меркаваць, што сучаснае верагоднае культурнае адраджэнне харнатопа Віцебска залежыць ува многім і ад айчынных сродкаў масавай інфармацыі.

**Літаратура**


1. *Бахтин М. М.* Вопросы литературы и эстетики / М.: Худож. лит., 1975. 504 с.
2. *Вайль П.* Гений места / М.: КоЛибри, 2006. 239 с.
3. *Шатских А. С.* Витебск. Жизнь искусства. 1917–1922 / М.: Языки русской культуры, 2001. 256 с.
4. *Мартинович В. В.* Витебский авангард 1918–1922 годов: художественная критика и социо-культурный контекст: дис. к-та фил. наук / Л. П. Саенкова. М., 2003. 122 л.
5. *Гриневская К.* Квартал а-ля Шагал? // Віцебскі рабочы. 2008. 11 снеж. С. 1.
6. *Агафонова Н. А.* Общая теория кино и основы анализа фильма / М.: Тесей, 2008. 392 с.
7. Французский режиссёр снимет фильм о витебской художественной школе // Бел. деловая газета [Электронны рэсурс]. 2003. 30 крас. Рэжым доступу: http://www.bdg.by/news.htm?43845,5.
8. *Фондаренко Н.* Когда вопросы задаёт … фотография // Віцебскі рабочы. 2008. 4 ліст. С. 6.
9. *Алимова Е.* Игра воображения Алена Флешера в рамках и отражениях // Музей Марка Шагала [Электронны рэсурс]. 2008. кастр. Рэжым доступу: http://www.chagal-vitebsk.com/?q=node/187.